Источник: “Настаўніцкая газета” – 2019-12-24

# Каля вытокаў Нёмана

Льецца Нёман паміж гораў, // Светлы, чысты, як з расы, // Накапаў ён ям і нораў, // Гоніць воду праз лясы… Гэтыя знакамітыя коласаўскія радкі справядлівыя ў дачыненні да Уздзенскага, Стаўбцоўскага, Карэліцкага, Навагрудскага, Іўеўскага, Лідскага, Шчучынскага, Мастоўскага, Гродзенскага раёнаў — тых мясцін, праз якія бацька Нёман нясе свае воды да Балтыйскага мора. І першым у гэтым спісе нездарма стаіць Уздзенскі раён — менавіта тут славутая рака пачынае спрадвечны шлях, тут знаходзяцца яе вытокі.

## Край літаратараў

Панямонне — край паэтаў і пісьменнікаў. А як жа іначай! Калі жывеш сярод чароўных даляглядаў, “дзе льецца Нёман срэбраводны, дубы дзе дружнай чарадою стаяць, як вежы, над вадою”, проста немагчыма не быць лірыкам. І самы лірычны, самы багаты на літаратараў-землякоў куточак Панямоння — гэта Уздзеншчына. Напрыклад, у вёсцы Вялікая Уса нарадзіўся Пятро Глебка, у Нізку — Кандрат Крапіва, Паўлюк Трус, Лідзія Арабей, у Забалацці — Алесь Махнач, дзіцячыя і юнацкія гады Алеся Якімовіча прайшлі ў Чурылаве. А яшчэ з Уздзеншчынай звязана жыццё продкаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча. Нездарма ва ўстановах адукацыі Уздзенскага раёна дзейнічае аж 5 літаратурных музеяў. Завітаем у музей імя Пятра Глебкі Ліцвянскага дзіцячага сада — базавай школы і ў музей Уздзенскай сярэдняй школы № 2 імя К.К.Крапівы. Акрамя таго, нас чакае падарожжа да вытокаў Нёмана, але гэта будзе другой часткай нашага наведвання Уздзеншчыны. Спачатку — у госці да літаратараў.

## “Бо я вясковы ўсё ж”

З жыццём пісьменнікаў, паэтаў можна знаёміцца розным чынам. Самы просты і даступны — на Вікіпедыі. Але ж там будуць толькі кароткія звесткі з біяграфіі, творчай спадчыны. Да таго ж не трэба забываць, што прыведзеныя ў інтэрнэце факты могуць не адпавядаць рэчаіснасці. Выверанымі будуць звесткі з падручнікаў па літаратуры. А вось унутраны свет, памкненні, захапленні аўтара раскрые знаёмства з яго творчасцю, нецпарэднае прачытанне твораў. І ўсё ж найбольш цікавы і часта непрадказальны спосаб — гэта знаёмства з асобай паэта праз гутарку з яго землякамі. Часта менавіта на гэтых сустрэчах можна пачуць факты, пра якія не прачытаеш ні ў падручніках, ні ў творах, ні тым больш у інтэрнэце.

У многіх людзей вобраз Пятра Глебкі асацыіруецца з вобразам савецкага паэта, які пісаў на патрэбу сваёй эпохі. Гэта, канечне, праўда. Аднак Пётр Фёдаравіч пісаў не толькі пра будаўніцтва светлага жыцця. Чаго варта яго знакамітае “О Беларусь, мая калыска, // Жыццё маё, прытулак мой!”. Канечне, усхваляе паэт тут і “заводы з белым дымам”, і тое, як на “спелых нівах ураджайных” “махаюць крыламі камбайны”. Аднак ключавымі з’яўляюцца першыя радкі, у якіх паэт “з гарачаю любоўю нізка” схіляецца перад Радзімай.

— Шкада, што творчасць нашага земляка не вывучаецца цяпер так шырока ў школе. А ў яго шмат цудоўных вершаў. Мне, напрыклад, падабаюцца вось гэтыя радкі: “Не выказаць таго ніякім словам, // Што сэрца мне паліла, як палын, // Калі, правёўшы сына за дуброву, // І бацька мне сказаў: — Ідзі адзін!..” Гэта радкі з верша “Ліст у вёску”. Яны аўтабіяграфічныя і апісваюць той момант, калі бацька праводзіў Пятра на вучобу ў Мінск у Белпедтэхнікум. Першая спроба была няўдалай, таму ён вяртаецца сюды і працуе сакратаром сельсавета, наступнае паступленне было ўдалым, — паведаміла настаўніца беларускай мовы і літаратуры Ліцвянскага дзіцячага сада — базавай школы Іна Уладзіміраўна Атрушкевіч.

З рэдкімі фотаздымкамі Пятра Глебкі, інфармацыяй пра яго родных, пра малую радзіму паэта можна азнаёміцца ў школьным музеі, які носіць імя паэта. Па словах настаўніцы, музей быў адкрыты ў 1970 годзе, на наступны год пасля адкрыцця школы. Першыя экспанаты сабраў настаўнік беларускай мовы і літаратуры Павел Іосіфавіч Махнач. Ён нават ездзіў да жонкі паэта Ніны Іларыёнаўны. Жанчына перадала фотаздымкі, былі зроблены іх копіі. Цэнтральнае месца ў экспазіцыі займае выява бацькоўскага дома паэта. Гэты дом згарэў у гады Вялікай Айчыннай вайны, аднак выява была адноўлена па ўспамінах родных, блізкіх паэта. На адкрыцці музея прысутнічалі жонка Ніна Іларыёнаўна, Заір Азгур падарыў бюст Пятра Глебкі. Шмат кніг з аўтографамі падарылі сябры паэта, пісьменнікі. У пазнейшыя гады ў музей наведваўся пляменнік Пятра Фёдаравіча Пятро Ліпай, сярод гасцей быў і кампазітар Ігар Лучанок.

У кожным школьным музеі можна знайсці арыгінальныя элементы афармлення экспазіцыі. У музеі Ліцвянскай школы такім элементам з’яўляюцца бярозы. Музейныя бярозы былі “пасаджаны” ў канцы 80-х. “Тады ў мяне быў клас, амаль адны хлопцы, якія вучыцца асабліва не хацелі, але былі працавітыя. Яны і “пасадзілі” са мной гэтыя бярозы, якія шумяць ужо каля 30 гадоў”, — згадала Іна Уладзіміраўна. Бярозы ў музеі — не выпадковасць. Па словах настаўніцы, у Пятра Глебкі ў творах даволі часта згадваюцца гэтыя дрэвы: “Дрыжаць у шэрані бярозы, // Бялеюць снежныя палі…” або “Бярозы ў шэрані сівеюць, // Палі бялеюць, як паркаль. // Зіма, зіма… Снягі, завеі, // Дарога звонкая, як сталь”.

Вобраз роднай вёскі, малой радзімы даволі часта сустракаецца ў творчасці Пятра Глебкі. Хаця, як прызналася настаўніца, паэт нячаста ў дарослыя гады наведваўся ў родныя мясціны. Затое, калі прыязджаў, то абавязкова адпраўляўся на ціхае паляванне — ён вельмі любіў збіраць грыбы. Пётр Фёдаравіч узначальваў Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору акадэміі навук, клопату ў яго хапала. Выдатна пра ўсё гэта гаворыцца ў вершы “Ліст у вёску”. Аўтар просіць прабачэння ў матулі, у родных, што забывае пра іх, што нячаста выпадае магчымасць прыехаць у родную вёску: “Я горад палюбіў з яго змаганнем, // Бо тут жыццё ідзе зусім інакш, // І ад яго я шлю вам прывітанне, // Бо я вясковы ўсё ж, я родны ваш”.

Гэтыя радкі выдатна характарызуюць паэта. Нягледзячы на клопаты жыцця ў горадзе, на змаганні, Пятро Глебка застаецца вяскоўцам. А яшчэ, нягледзячы на цяжкі, супярэчлівы час, у які Пятру Фёдаравічу выпала нарадзіцца і жыць, яму ўдалося застацца годным чалавекам.

## “Я — пякучка-крапіва”

“Нягледзячы на тое, што абодва нарадзіліся на Уздзеншчыне, сябравалі, яны былі зусім розныя. Глебка — лірык, а Крапіва — сатырык. Крапіва быў асаблівым чалавекам. У яго, напэўна, не было шмат адданых сяброў. Па жыцці ён ішоў неяк сам па сабе. Быў строгі, патрабавальны, надзвычай адказны. З такімі людзьмі сябраваць цяжка”, — так ахарактарызавала адносіны паміж землякамі і сябрамі кіраўнік музея Уздзенскай сярэдняй школы № 2 імя К.К.Крапівы Таццяна Мікалаеўна Пагоня. Дадала жанчына яшчэ цікавы факт: “Калі Пятро Глебка любіў збіраць грыбы, то Кандрат Крапіва любіў рыбалку, разам з іншымі пісьменнікамі часта наведваўся на Нарач, на малую радзіму Максіма Танка”. Вось як пісаў пра свайго сябра і земляка сам Пятро Глебка: “Крапіва, безумоўна, вялікі майстар байкі і камедыі, але ён і добры лірычны паэт, і цудоўны бытапісец. Дыяпазон яго творчасці вельмі шырокі”.

“Асабіста я з Кандратам Крапівой не была знаёма, — расказвае Таццяна Мікалаеўна. — Адзіная сустрэча адбылася ў мае студэнцкія гады. Як напамін пра яе — аўтограф пісьменніка на кнізе з яго творамі. Гавораць, што Крапіва быў чалавекам, які вельмі любіў сваю радню. Яго дзеці — гэта было яго ўсё. Я чытала яго перапіску з

сынам, які загінуў пад Сталінградам — для мяне гэта было сапраўднае адкрыццё, вельмі кранальна. Да ўсяго астатняга ён больш спакойна ставіўся. Але ён ніколі не быў абыякавым. У яго была такая прымаўка: работу трэба адседжваць, нават калі няма чаго рабіць. Гэта сведчыць, што ён быў абавязковым, адказным, асабліва калі займаўся навукай. Усё жыццё любіў адну жанчыну, ў яго не было іншага кахання, што таксама немалаважна. Яны разам з жонкай Аленай Канстанцінаўнай былі з адной вёскі”.

“У жыцці Кандрат Крапіва быў сапраўдным беларусам, з беларускім менталітэтам, які заўсёды працаваў на патрэбу часу, — далучыўся да размовы настаўнік гісторыі Андрэй Мікалаевіч Ярмольчык. — Неабходна было зямлю араць — ён яе араў (у прамым сэнсе, бо быў селянінам), трэба было дзяцей вучыць — ён вучыў, здаўшы экстэрнам экзамены на народнага настаўніка з правам выкладаць у народнай пачатковай школе. Трэба было ваяваць — ён ваяваў. Ён скончыў паскораныя курсы прапаршчыкаў, удзельнічаў у Першай сусветнай вайне, быў камандзірам роты — самае цяжкае званне, бо ротныя гінулі вельмі часта. Ваяваў на Румынскім фронце ў самы складаны перыяд вайны, у 1916—1917 гады. Вярнуўся, пачаў настаўнічаць. Калі Польшча акупіравала беларускія землі, то Кандрат Крапіва зноў узяўся за зброю. Калі настаў мірны час, ён пачаў спрабаваць сябе ў літаратуры. Спачатку пісаў на рускай мове, але калі пачалася беларусізацыя, патрэбны былі людзі для развіцця беларускай мовы, і ён уключыўся ў гэтую справу. А калі нашай літаратуры не хапала драматычных твораў і патрэбны былі драматургі, асабліва байкапісцы, то спрабавалі многія, але Крапіве гэта ўдалося лепш за ўсіх. Ён выконваў сацыяльны заказ, стаў драматургам. У савецка-фінскую вайну камандаваў кулямётнай ротай, а ўжо ў Вялікую Айчынную быў ваенным карэспандэнтам, выпускаў газету-плакат “Раздавім фашысцкую гадзіну”. Немцы былі пад Сталінградам — было не да смеху. І трэба было майстэрства, каб выпускаць такую газету, праз гумар фарміраваць у людзей веру ў перамогу. Пасля вайны заняўся навукай”.

Пра Кандрата Кандратавіча Атраховіча ў музеі другой уздзенскай школы могуць расказваць гадзінамі. Каля 150 экспанатаў асноўнага і больш за 100 экспанатаў дапаможнага фонду захоўваюцца ў чатырох раздзелах: “Ад маленства да сталасці…”, “Творчая дзейнасць”, “Дзейнасць у акадэміі навук”, “Нацыянальны акадэмічны тэатр”. Галоўная роля адводзіцца кнігам. У экспазіцыі прадстаўлены практычна поўны збор празаічных, паэтычных, літаратурна-крытычных твораў пісьменніка. Асабліва каштоўныя асабістыя рэчы Кандрата Крапівы: плашч, кашуля, шалік, гальштук, прылады для галення.

“Здаецца, наш знакаміты зямляк многа пражыў, павінна быць і шмат слядоў, але калі зайшла размова пра стварэнне музея, то знайсці ўласныя рэчы было вельмі складана. Шмат было прыкладзена намаганняў, каб сабраць змешчаныя тут матэрыялы. Праз экспанаты намагаемся перадаць той час, у які жыў і ствараў свае неўміручыя творы наш славуты зямляк. Музей адкрыўся ў 1996 годзе і ўяўляў спачатку невялікі музейны пакой. На адкрыцці чырвоную стужачку перараза́ў наш пісьменнік-зямляк Алесь Махнач, а таксама нявестка Кандрата Крапівы. З 2014 года школьны музей атрымаў новую прапіску — утульнае светлае памяшканне з новай мэбляй”, — паведаміла Таццяна Мікалаеўна.

Музей — візітоўка школы. Акрамя экскурсій, тут праходзяць урокі літаратуры. Традыцыяй стала правядзенне крапівінскага тыдня ў сакавіку. У гэтым годзе былі падрыхтаваны класныя гадзіны “Ад маленства да сталасці”, “Крапіва-байкапісец”, “Крапіва-драматург”, “Крапіва-навуковец”, “Крапіва-сатырык”, “Крапіва і вайна”, арганізоўваліся выставы малюнкаў “Малюем байкі”, выставы плакатаў, газет, буклетаў “Я — пякучка-крапіва…”, адбываліся інсцэніроўкі баек.

“Дыпламаваны баран”, “Дзед і баба”, “Ганарысты парсюк” — кожны з нас згадае некалькі радкоў гэтых знакамітых баек Кандрата Крапівы, якія мы вывучалі яшчэ ў школьныя часы. Кожная байка — гэта не толькі выкрыццё пэўных чалавечых заган, гэта сведчанне майстэрства аўтара. Выкрываць тыя ці іншыя заганы ў жартоўнай форме і праз гэта імкнуцца зрабіць жыццё грамадства лепшым можа толькі сапраўдны майстар слова. “Я ў мастацкім агародзе // Толькі марная трава. // А якая? Смех, дый годзе: // Я — пякучка-крапіва”. Канечне, Кандрат Кандратавіч не быў марнай травой у мастацкім і літаратурным агародзе. Наадварот, ён быў і застаецца адной з яркіх постацей у літаратурным і навуковым свеце нашай краіны.

## Залатое кола

“Кожны край — унікальны. Так мы з калегамі гаворым і пра нашу Уздзеншчыну. Мы яе любім і намагаемся захоўваць спадчыну для наступных пакаленняў, — падзяліўся Андрэй Мікалаевіч Ярмольчык. — А спадчына наша багатая. Гэта ў першую чаргу вытокі Нёмана, адзінай ракі еўрапейскага маштабу, якая пачынаецца на беларускай зямлі. Толькі за гэта можна любіць уздзенскі край і ганарыцца ім. Па-другое, на Уздзеншчыне карані класікаў беларускай літаратуры. Напрыклад, адносна Якуба Коласа гэта знакамітае ўрочышча Ліпава на мяжы са Стаўбцоўскім раёнам. Уздзенскі касцёл — месца хрышчэння продкаў Янкі Купалы. Жыццё родных Максіма Багдановіча па матулінай лініі звязана з Мякатамі — вёсачкай на мяжы з Мінскім раёнам. Уздзеншчына — гэта і радзіма беларускага кнігадрукавання. У 1572 годзе Сымон Будны зрабіў ва Уздзе свой пераклад Евангелля. Яшчэ Уздзеншчына — гэта малая радзіма паэтаў і пісьменнікаў”.

Экскурсійны маршрут “Вытокі Нёмана”, складзены Андрэем Мікалаевічам разам з удзельнікамі гуртка “Сцяжынкамі Уздзеншчыны” Уздзенскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі, якраз праходзіць праз гэтыя мясціны. Па словах педагога, маршрут аўтамабільны і з’яўляецца адной з частак шматлікіх мерапрыемстваў, якія праводзяцца цэнтрам да Года малой радзімы. Калі паглядзець на карту маршруту, то можна заўважыць, што ён падобны на своеасаблівае залатое кола, пачатковай і канцавой кропкай якога з’яўляецца райцэнтр. Тэматычная экскурсія “Вытокі Нёмана” працягласцю 78 км знаёміць удзельнікаў з гісторыяй развіцця наднёманскага краю, выдатнымі мясцінамі, выбітнымі помнікамі культуры, этнаграфіі, прыроды, а таксама з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, якія адбываліся на гэтай тэрыторыі. Маршрут пралягае праз Узду, Забалацце, Калінінск, Пырашава, Даўгінава, Верх-Нёман, Крэстінтэрн, Ясень, Антанова, Першамайск, Сямёнавічы, Астравок, Наднёман. Пра кожны аб’ект настаўнік раскажа шмат цікавых фактаў.

“Гавораць, даўным-даўно з-пад вялізнага каменя, дзе біла крынічка, нарадзіўся волат Нёман, — расказваў легенду пра Нёманец і Лошу Андрэй Мікалаевіч, калі мы разам з дырэктарам Уздзенскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Ірынай Анатольеўнай Афанасьевай дабраліся да вытокаў Нёмана. — Быў ён прыгожы і працавіты. А побач жыла гультаяватая Лоша. Толькі і рабіла, што адпачывала ў цяньку, сабою любавалася. Лоша часта наведвалася да свайго суседа, а за маўклівасць называла яго Нёманцам. Пакахаў Нёман Лошу. Былі на іх вяселлі і Сула, і Уса, і Уздзянка, і Шчара. Пасля вяселля працягваў Нёман паіць, карміць і чалавека, і звера, і птушку, і рыбу, насіў на сваіх грудзях чоўны і плыты. Лоша ж працягвала ляжаць у цяньку, не хацела дзяліць з Нёманам радасці і нягоды. Абрыдла Нёману такое жыццё. Прачнулася аднойчы Лоша, а Нёмана няма. Пачала даганяць, ды не ў той бок кінулася. Клікала на дапамогу, але ніхто не дапамог: ні Пціч, ні Бярэзіна, ні Свіслач. Толькі Выня паспачувала, разам з ёй знайшла Нёман каля сённяшняй вёскі Пясочнае. Хвалямі горкіх слёз кінулася Лоша да свайго волата. Нёман і цяпер не забывае пра родныя мясціны. Кожную вясну і восень дажджлівай парой вяртаецца да сваёй матулі-крынічкі”.

Легенда прыгожая. Аднак, на жаль, крынічкі ўжо няма. У 30-я гады вялізны валун, з-пад якога струменіла вада, узарвалі, а калі правялі меліярацыю, то крынічка перасохла, а рэчышча Нёманца і Лошы стала каналізаваным. Выказваліся прапановы па забалочванні гэтых мясцін, але праца патрабуе значных фінансавых выдаткаў. Цяпер гэтая тэрыторыя ўваходзіць у заказнік “Вытокі ракі Нёман”.

## Незабыўная экскурсія

Чаму першай згадкай пра Узду ў гістарычных дакументах трэба лічыць не 1494, а 1450 год? Чаму ўрочышча каля райцэнтра называецца “Гагарынскія палеткі”? Дзе продкі Янкі Купалы арандавалі зямлю? Уладальніцай якога маёнтка была беларуская мецэнатка Марыя Магдалена Радзівіл? Адказы на гэтыя і шматлікія іншыя пытанні вы можаце атрымаць, адправіўшыся разам з Андрэем Мікалаевічам па маршруце “Вытокі Нёмана”. І, канечне, вас чакае сустрэча з Нёманцам і Лошай. Вас чакае Уздзеншчына — самы маляўнічы куточак Панямоння.